СМІ ў законе
*Стар. 3*

Штрафное правосудие
*Стар. 5*

Рэгіёны
*Стар. 6-7*

№45
ЛЮТЫ 2009

# Выбар

Газэта Магілёўскай абласной кааліцыі дэмакратычных сілаў

# Пад кантролем у народа

«Народны кантроль». Такую назву далі грамадзкія актывісты Магілеўшчыны новай газэце, першы нумар якой пабачыў сьвет напачатку лютага. Падставы для выпуска такога выданьня ў Магілеўскай вобласьці вельмі сур'езныя. Нават па словах найвышэйшых беларускіх чыноўнікаў, рэгіен паграз у карупцыі. Але дзе можна прачытаць, ці яшчэ неяк даведацца пра "выбрыкі" нашых чыноўнікаў? У дзяржаўных выданьнях усе, як правіла, "ціха-гладка". Недарма абласная Кааліцыя дэмсілаў вымушана была стварыць уласны грамадзкі камітэт, друкаваным органам якога і стала новая газэта.

Вось толькі частка лічбаў і фактаў, якія ў апошні час "раскапалі" магілеўскія антыкарупцыянеры. Ці няпраўда - ўраждвае?!

1500 даляраў – такі сярэдні памер выяўленага хабару на Магілеўшчыне.

21 выпадак хабарніцтва выяўлены за 11 месяцаў мінулага года ў органах дзяржаўнага кіраваньня. Але гэта, аказваецца, "кветачкі". У сельскай гаспадарцы падобны паказчык утрая, а ў прамысловасьці – ўчацьвера большы.

Рэкорднай, напэўна, сумай хабару, зь якой злавілі нячыстага нячыстага на руку кіраўніка абласнога масштабу праваахоўныя органы, стала ні многа ні мала – 45 тысячаў даляраў.

"Уровень преступности в регионе выше, чем в среднем по республике. Многие кор¬рупционные преступления вскрываются запоздало, что нередко приводит к причинению на протяжении длитель¬ного времени ущерба в осо¬бо крупном размере. Позволяют чиновникам принять меры к сокрытию денежных средств, других материаль¬ных ценностей, добытых пре¬ступным путем либо легализо¬вать их."

Гэта сказаў не які-небудзь "злаўмысны апазыцыянер". Цытата, паводле "Інтэрфакса", належыць Аляксандру Лукашэнку, які праводзіў нядаўна адпаведную нараду.

Калі вы, шаноўны чытач, хочаце ведаць падрабязнасьці, то чытайце "Народны кантроль".

*Іван Марозаў*



РАДАКТАРАМ НОВАГА ВЫДАНЬНЯ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ВЯДОМЫ БЯЛЫНІЦКІ ЖУРНАЛІСТ БАРЫС ВЫРВІЧ. ЗЬВЯЗАЦЦА ЗЬ ІМ МОЖНА ПА ТЭЛЕФОНЕ 8 02232 37110, АЛЬБО ПРАЗ E-MAIL:NARODNYKANTROL@GMAIL.COM

# Рыхтуемся да сьвята

Магілёўская абласная кааліцыя дэмакратычных сіл рыхтуецца адзначыць 91-я ўгодкі абвяшчэння незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі

Да 25 сакавіка плануецца падрыхтаваць, выдаць і распаўсюдзіць шэраг інфармацыйных матэрыялаў, прысвечаных гэтай знамянальнай гістарычнай падзеі. Таксама ў малатиражных газетах, якія выдаюцца ў Магілёўскай вобласці пры дапамозе кааліцыі дэмакратычных сіл, будуць надрукаваны адмысловыя матэрыялы, распавядаючыя пра Дзень Волі і аднаўленне Беларускай дзяржаўнасці ў 1918 годзе.

У бліжэйшы час у Магілёўскі гарвыканкам будзе пададзена заяўка на правядзенне 22 сакавіка, у нядзелю, святочнага мітынга, прымеркаванага да 91-х угодкаў абвяшчэння БНР. Да Дня Волі сябры кааліцыі плануюць арганізаваць кінапрагляд фільмаў, прысвечаных гісторыі Беларускай Народнай Рэспублікі, правесці тэматычную экскурсію па памятных месцах Магілёва, звязаных з падзеямі 1918 года, наладзіць святочны канцэрт.

Непасрэдна 25 сакавіка вечарам адбудзецца ўскладанне кветак да будынку краязнаўчага музея, у якім 12 ліпеня 1918 года на сходзе грамадскасці Магілёва была прызнаная ўлада БНР. Пасля мерапрыемства будзе праведзена святочная вечарына з запрашэннем ветэранаў дэмакратычнага руху Магілёўшчыны.

*Барыс Вырвіч*

# Улады не раяцца з людзьмі

Удзельнікі Горацкай антыядзернай групы і сябры Руху "За Свабоду" збіралі подпісы супраць АЭС у Мсціславе.

За дзве гадзіны актывісты абышлі некалькі сотняў кватэраў. Кожная наведаная сям'я атрымала брашуру "Міфалогія мірнага атаму", у якой вядомы горацкі журналіст Эдуард Брокараў прывёў абгрунтаваныя адказы на галоўныя міфы пра ядзерную энергетыку.

– Ходзячы ад дзвярэй да дзвярэй, найчасцей можна было пачуць нараканні людзей, што ўлада зусім не раіцца па такім важным пытанні як будаўніцтва АЭС або яе размяшчэнне. Людзі кажуць: у нас нічога не пытаюць, – дзеліцца сваімі ўражаннямі лідэр групы Пётр Маланачкін.

У выніку акцыі ў скарбонку антыядзершчыкаў патрапіла яшчэ 140 подпісаў грамадзянаў, нязгодных з пабудовай АЭС у Беларусі.

# Рэкордная інфляцыя за студзень

У БЕЛАРУСІ Ў СТУДЗЕНІ 2009 ГОДУ СПАЖЫВЕЦКІЯ КОШТЫ ВЫРАСЬЛІ НА 4,1% ПАСЬЛЯ РОСТУ НА 1,2% ЗА СЬНЕЖАНЬ 2008 ГОДУ, ПАВЕДАМЛЯЕ БЕЛСТАТ.




Дадзены ўзровень студзеньскай інфляцыі зьяўляецца абсалютным рэкордам са студзеня 2003 году, калі спажывецкія кошты вырасьлі на 4,3% за месяц.

Мінэканомікі чакала інфляцыю ў студзені ў межах 3,5%.

Інфляцыя ў Беларусі 2005-2008 гг

Як паведамляе Інтэрфакс, асноўнымі прычынамі ўсплёску інфляцыі ў студзені зьяўляецца разавая дэвальвацыя беларускага рубля на 20% і адміністрацыйнае падвышэньне тарыфаў на паслугі ЖКГ.

Зацьверджаны прагноз на 2009 год прадугледжвае абмежаваньне росту спажывецкіх коштаў у межах 9-11%.

Між тым, Эўрапейскі банк рэканструкцыі і разьвіцьця (ЭБРР) прагназуе значнае падзеньне тэмпаў росту ВУП Беларусі ў 2009 годзе і рост інфляцыі ў раёне 15%.

# СМІ ў законе

НАБЫЎ ЮРЫДЫЧНУЮ МОЦ НОВЫ ЗАКОН АБ СМІ. БЕЛАРУСКІ ПАРЛАМЕНТ ПРЫНЯЎ ЯГО ЛЕТАСЬ У ЖНІЎНІ. СЯРОД НЕЗАЛЕЖНЫХ ЖУРНАЛІСТАЎ ЁН АДРАЗУ Ж АТРЫМАЎ НАЗВУ "ДРАКОНАЎСКАГА ЗАКОНУ". ЯК НОВЫЯ ПРАВАВЫЯ НОРМЫ СТАСУЮЦЦА З ПАЛІТЫЧНАЮ ЛІБЕРАЛІЗАЦЫЯЙ, ЯКУЮ АПОШНІМ ЧАСАМ АБВЕСЦІЛІ ЎЛАДЫ КРАІНЫ?

АНДРЭЙ СКУРКО, РЭДАКТАР ГАЗЕТЫ "НАША НІВА":

"Жыць стала намнога лепей, жыць стала намнога весялей".

Дагэтуль журналісты працавалі паводле закону, прынятага ў 1995 г. Новы дакумент больш канкрэтны і жорсткі.

Новымі нормамі прадугледжваюцца:

– ПЕРАРЭГІСТРАЦЫЯ МЕДЫЯЎ

Усе медыйныя сродкі мусяць перарэгістравацца да лютага 2010 г. Раней гэты пункт даваў магчымасць зліквідаваць выданне, адмовіўшы яму ў перарэгістрацыі. Аднак тут адбыліся змены.

ЖАННА ЛІТВІНА, СТАРШЫНЯ БАЖ:

"На сённяшні дзень, рэгіструючы СМІ, не трэба ўзгадняць месца размяшчэння рэдакцыі з мясцовай уладаю".

А намесніца міністра інфармацыі дадае:

ЛІЛІЯ АНАНІЧ, НАМЕСНІЦА МІНІСТРА ІНФАРМАЦЫІ:

"Не дазваляецца неабгрунтаваная адмова ў акрэдытацыі журналістаў".

А абгрунтаванні могуць быць розныя. Месяц таму ў акрэдытацыі адмовілі журналістам радыё "Рацыя". Матывацыя? Бо раней яны працавалі без акрэдытацыі.

– АБАВЯЗКОВАЯ АКРЭДЫТАЦЫЯ ЗАМЕЖНЫХ ЖУРНАЛІСТАЎ

– ЛІМІТ УДЗЕЛУ ЗАМЕЖНАГА КАПІТАЛУ – 30%

Закране гэта перадусім тыя беларускія медыі, што былі змушаныя зарэгістравацца за межамі Беларусі. Цяпер, калі журналісты гэтых медыяў будуць працаваць без акрэдытацыі беларускага МЗС, іх чакае крымінальная адказнасць.

– ПАПЯРЭДЖАННЕ РЭДАКЦЫІ МОЖА ВЫНЕСЦІ НАВАТ РАЁННАЯ АДМІНІСТРАЦЫЯ

Паводле закону, атрымаўшы 2 такія папярэджанні сродак інфармацыі можна закрыць. А мясцовыя чыноўнікі інтэрпрэтуюць законы па-рознаму. Ускосна гэта пацвярджае намесніца кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта

НАТАЛЛЯ ПЯТКЕВІЧ, НАМЕСНІЦА КІРАЎНІКА АДМІНІСТРАЦЫІ ПРЭЗІДЭНТА:

"Цяпер вельмі істотна забяспечыць яго правільнае ўжыванне на месцах, каб другі бок – прадстаўнікі дзяржаўных органаў – не дадумвалі".

– КАНТРОЛЬ ДЗЕЙНАСЦІ ІНТЭРНЭТ-ВЫДАННЯЎ

Гэта адзіны артыкул новага закону, выкарыстоўваць які ўлады пакуль не збіраюцца.

Улады адмовіліся выкарыстоўваць адзін артыкул, але шмат хто з журналістаў перакананыя, што непрымальная ўся медыйная палітыка дзяржавы.

АНДРЭЙ СКУРКО, РЭДАКТАР ГАЗЕТЫ "НАША НІВА":

"Па-ранейшаму вельмі складана незалежным газетам распаўсюджваць пра сябе інфармацыю".

АНАТОЛЬ САНАЦЕНКА, РЭДАКТАР ГАЗЕТЫ "БАБРУЙСКІ КУР'ЕР":

"Улады не адмаўляюцца ад сваёй рэпрэсіўнай палітыкі ў дачыненні СМІ".

ЖАННА ЛІТВІНА, СТАРШЫНЯ БАЖ:

"Выканаўчая ўлада павінна адмовіцца ад манаполіі на інфармацыйную прастору".

Тым часам улады кажуць пра дыялог з недзяржаўнымі журналістам. Апошні доказ таго – стварэнне Каардынацыйнае рада ў сферы СМІ. Толькі яе кіраўнік перакананы, што таленту ніякі закон перашкодзіць не можа.

ПАВЕЛ ЯКУБОВІЧ, РЭДАКТАР ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСЬ СЕГОДНЯ»:

«Пры любым законе могуць быць і павінны быць журналісты, якія з'яўляюцца зоркамі, таксама як пры кожным законе ёсць журналісты шэрыя і непрыкметныя».

А Наталля Пяткевіч мяркуе, што новы закон ідэальна збалансаваны для ўсіх журналістаў.

НАТАЛЛЯ ПЯТКЕВІЧ, НАМЕСНІЦА КІРАЎНІКА АДМІНІСТРАЦЫІ ПРЭЗІДЭНТА:

"Калі адзін кажа, дайце мне свабоду слова, а другі хоча быць абароненым ад гэтай свабоды, вельмі істотна знайсці баланс".

На Захадзе ж урадавыя структуры не балансуюць. Калі ўлады Беларусі шукаюць баланс, у дэмакратычных краінах падыход да праблемаў свабоды слова знайшлі даўно. Спрэчныя сітуацыі там развязвае суд. Незалежны суд.

***Вольга Швед, "Белсат"***

№45 ЛЮТЫ 2009 Выбар



# Бабруйчане не давяраюць міліцыі

Міліцыянер - абыякавы, пасіўны, грубы і бестактны. Так характарызуюць "вартавых парадку" жыхары нашага горада.

На працягу апошніх год МУС праводзіць вывучэнне грамадскай думкі аб дзейнасці органаў унутраных спраў. Леташняе апытанне не зафіксавала змен грамадскай думкі, жыхары Бабруйска па ранейшаму сутыкаюцца з адмоўнымі рысамі характару супрацоўнікаў міліцыі. Аб гэтым казалі каля 20% бабруйчан, што з'яўляецца адным з самых горшых паказчыкаў па краіне.

Узаемаадносіны бабруйскіх супрацоўнікаў міліцыі з грамадзянамі на думку начальніка галоўнага арганізацыйна-аналітычнага упраўлення МУС палкоўніка міліцыі Андрэя Бароўскага, можна назваць крытычнымі.

Бабруйчане падчас апытання паказалі, што супрацоўнікі міліцыі самі парушаюць закон выканання, якога павінны дамагацца. Так бабруйчане адзначылі, што супрацоўнікі міліцыі на службовых аўтамабілях самі парушаюць Правілы дарожнага руху, не прапускаючы пешаходаў на пераходах.

Па рэйтынгу даверу ЎУС Бабруйска знаходзіцца ў хранічных аўтсайдарах. Праца бабруйскіх супрацоўнікаў міліцыі па заваёве даверу грамадзян два гады запар прызнаецца незадавальняючай.

*Мацьвей БАГУН, фота з архіва*

## "З БАРАКУ – У ТРУШЧОБЫ"

У Бабруйску ёсьць барак. 2 гады таму, перад "Дажынкамі" ў ім зрабілі рамонт, жыльцы таксама самі рамантавалі свае кватэры. Зараз гарадзкія улады вырашылі гэты барак зьнесьці.

Распавядае журналіст газэты "Бобруйский курьер" Віктар Качан:

"Тыя, хто не прыватызаваў кватэры, атрымалі новае жытло. А тых, хто прыватызаваў, гарадзкія улады вырашылі адсяліць. Прычым, у такое жытло, якое нашмат горш за той барак, у якім яны дагэтуль жылі – дом, якому 110 гадоў. І па пляне праз 10 гадоў яго будуць зносіць. Атрымліваецца, што зноў часовае жытло. Жыхары змагаліся з чыноўнікамі, дайшлі да старшыні Магілёўскага аблвыканкаму Барыса Батуры, які паабяцаў ім новае жытло да Новага году. Пакуль абяцаньне гэта ня выканана".

# "Славянка" спыняе мадэрнізацыю

ААТ "Славянка" не будзе ўкладваць грошы аб мадэрнізацыю вытворчасці .Сёлета плануецца набыць толькі дзве пяцельныя машыны "Джукі".

Аб гэтым заявіў на планавай нарадзе дырэктар ААТ "Славянка" Таймураз Бачарашвілі. Плануецца рабіць мінімальныя закупы. Набыццё астатняга абсталявання будзе рабіцца па меры неабходнасці

У мінулым годзе укладанні ААТ "Славянка" ў абсталяванне склалі больш 1 млрд. рублёў.

# Бабруйск ідзе да банкруцтва

Расходныя артыкулы гарадскога бюджэту значна перавышаюць паступленні. Верагодна, што ўвесь гадавы бюджэт Бабруйска будзе выдаткаваны ў першым квартале гэтага года.

Аб гэтым паведаміла газеце «Вечерний Бобруйск» начальнік фінансавага аддзела Галіна Яраш.

Нягледзячы на зніжэнне выдаткаў гарадскога бюджэту, у снежні 2008 года - 27 млрд. руб, і у студзені 2009 года - 21 млрд. руб. Катастрафічна скарачаюцца паступленні. За студзень у гарадскі бюджэт паступіла 15 млрд. руб. У лютым паступленні ў бюджэт плануюцца ў аб'ёме 11, а ў сакавіку - 8,8 млрд руб.

Такім чынам за першы месяц гэтага года дэфіцыт гарадскога бюджэту склаў каля 6 млрд. руб. Якім будзе дэфіцыт бюджэту ў бліжэйшыя некалькі месяцаў, калі паступленні ў гарадскую «казну» паменшацца ў два разы?

*Мацьвей БАГУН*

# Штрафное правосудие

Среди климовичских предпринимателей у меня много хороших знакомых. Дело, наверное, в том, что всегда уважал и уважаю тех, кто не боится рискнуть и побороться за своё будущее, за лучшее место под солнцем. Стремление к индивидуальной выгоде, если оно не вредит интересам других людей, потенциально приносит пользу всем. Обращение к истории показывает, что именно такие личности, претендовавшие на большее, двигали вперёд социальный прогресс. Здоровое честолюбие, здравый смысл и желание жить лучше породили нашу цивилизацию.

Эти мысли и выводы давным-давно считаются азбучными истинами в любой стране, во всём мире. Наконец вроде и на постсоветском пространстве бывшего СССР научились нормальным тоном произносить «частник», «бизнес», «наёмный работник». Но отдельные пережитки, тем не менее, остались, а засевшее в умах социалистическое прошлое нет-нет, да и реагирует на капиталистическое настоящее. До сего дня самым характерным и наиболее стойким рудиментом общественного сознания является негативное отношение к предпринимательству.

Показательно, что в Беларуси подобные негативные оценки в адрес предпринимателей культивируются на самом верху пирамиды власти (например, чего стоит одно только выражение нашего фараона «вшивые блохи»). А неустанная, многолетняя деятельность чиновников, без устали изобретающих меры по сдерживанию и ограничению частной инициативы! Не допустить, урезать, ликвидировать и практически всегда и обязательно — наказать. Наказать материально, то есть наложить такие штрафные санкции, чтобы жить не хотелось.

Последние законотворческие новации власти, к сожалению, только оправдывают наши опасения. Вопреки декларируемым заявлениям о начавшейся эре свободы и либерализации, номенклатурный крот продолжает настойчиво подкапываться под многострадальный отечественный бизнес. Не так давно правительство разработало и передало президенту проект закона «О внесении изменений и дополнений в некоторые кодексы Республики Беларусь по вопросам уголовной и административной ответственности». Суть законопроекта проста, в нём предлагается пересмотреть размеры штрафов за правонарушения в сфере предпринимательства. Отдельные штрафные санкции планируется снизить, но в целом речь идёт о том, чтобы УВЕЛИЧИТЬ ИХ В ДВА РАЗА. Согласно законопроекту ИП за разные нарушения может получить штраф от 400 до 1000 базовых величин, юрлицо — до 2000 базовых величин.

Владимир Карягин, председатель Минского союза предпринимателей и работодателей возмущенно констатирует: «На протяжении всего года бизнес-сообщество ведёт с правительством диалог о смягчении штрафных санкций, а что мы получаем в итоге: сплошное ужесточение». И это не эмоции, а реакция на то, что чиновники считают возможным штрафовать ИП на сумму до 35 миллионов рублей. Впрочем, не следует забывать, что у нас в стране вовсю процветает штрафное правосудие. Вот, например, компетентное мнение заслуженного юриста Валерия Фадеева: «Составлять протоколы об административных правонарушениях сегодня вправе должностные лица 68 органов, а рассматривать дела об указанных нарушениях имеют право 27 органов, в том числе суд…Если мы проанализируем Кодекс об административных правонарушениях, то увидим, что в некоторых главах, кроме штрафа, никакой иной вид ответственности не предусмотрен. То есть законодатель изначально ориентировал правоприменителей на штрафы».

Это мнение подтверждается при рассмотрении опыта правоприменителей местного масштаба. Обратимся к весьма интересному документу. Это решение Климовичского райисполкома от 25.04.2007 «О наделении должностных лиц Климовичского райисполкома полномочиями на составление протоколов об административных правонарушениях». В соответствии с принятым решением райисполком наделил соответствующими полномочиями почти два десятка должностных лиц. Среди них, к примеру, начальник и главные специалисты отдела ЖКХ, главный специалист и главный агроном райсельхозпрода, заведующий отделом идеологии, главный архитектор и мн. др. чиновники. В общем, штрафуй все кому не лень. А некоторые пункты решения просто вызывают удивление. Ладно, зав отделом идеологии получила право налагать взыскания за «Нарушение установленного законом порядка подсчёта голосов». Кто знает, может и пригодится когда-нибудь, не последние выборы в стране. Но почему начальник отдела экономики райисполкома, а не работники лесхоза, имеет право штрафовать за «Самовольный сбор или уничтожение грибов, других дикорастущих растений, относящихся к видам, включенным в Красную Книгу»? Чтобы, как в популярном мультфильме, знали — «чьи в лесу шишки»? Вроде бы мелочь, а задумаешься и понимаешь, что это штрафное правосудие в действии.

*Сергей АРЖАНЦЕВ*

№45 Люты 2009 Выбар

КЛІМАВІЧЫ

# Носителей ВИЧ-инфекции стало в 9 раз больше

Уже 20 лет подряд во многих странах мира отмечают Международный день борьбы со СПИДом. Не забывают эту дату и в Беларуси. Причины понятны, ведь распространение этой смертельной болезни среди белорусов всё больше принимает характер эпидемии. Количество установленных случаев ВИЧ-инфицирования поражает воображение даже специалистов, тщательно отслеживающих распространение болезни. Вот последние данные, предоставленные независимым СМИ Лилией Мелешко, заведующей отделением профилактики ВИЧ-СПИД Республиканского центра гигиены, эпидемиологии и общественного здоровья. По статистике центра в стране зарегистрировано 9423 случая ВИЧ-инфекции. Это значительная цифра, которую уже нельзя игнорировать или не замечать.

Самая сложная ситуация по-прежнему в Светлогорске, где только с января по октябрь текущего года были выявлены 123 носителя ВИЧ-инфекции. К настоящему времени в этом городе от СПИДа, по официальным данным, умерло более 600 человек. Положение катастрофическое, но насколько лучше оно в других населенных пунктах страны? Следует признать, что люди очень плохо информированы и в большинстве своём абсолютно не владеют сведениями о случаях заражения на местах. Да и откуда появиться объективной информации, если о проблеме вспоминают лишь тогда, когда нужно символически отметить День борьбы со СПИДом.

Вот и в этом году в климовичской районной газете "Родная Ніва" была помещена традиционная статья «Профилактика ВИЧ-инфекции». Начинается она тоже более чем традиционно: «Профилактические меры, предпринимаемые государством, направлены на снижение темпов распространения ВИЧ-инфекции на территории нашего государства». Далее повествуется о том, что в Беларуси разработана государственная программа профилактики, основной целью которой является стабилизация и снижение уровня инфицированности. Характерно, что в статье не приводятся данные о количестве ВИЧ-инфицированных ни в «нашем государстве», ни тем более в Климовичском районе. Это легко объяснимо, так как эти цифры сразу покажут очевидную бесплодность госпрограмм и профилактических мер. О чём говорить, если даже в провинциальных Климовичах результаты выявления носителей ВИЧ-инфекции в последнее время просто шокируют. В начале 2008 года был установлен один такой случай, а сейчас, всего через полгода, их официально зарегистрировано — 9. Климовичи, конечно, не Светлогорск, но темпы распространения смертельно опасной заразы вызывают, откровенно говоря, дурные предчувствия.

*Сергей АРЖАНЦЕВ*

БЯЛЫНІЧЫ

# Дык хто ж наведаў наш раён?

Напрыканцы студзеня Бялыніцкі раён наведаў новы старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік. Паездка была азнаямляльная, гэта быў першы візіт кіраўніка вобласці ў наш рэгіён, таму асноўную ўвагу спадар Руднік надаў наведванню мясцовых вытворчых аб'ектаў. У Бялынічах старшыня аблвыканкама наведаў цэх па вытворчасці сыроў ААТ "Бабуліна крынка", у Цехціне – крухмальны завод і жывёлагадоўчы комплекс ААТ "Новая Друць".

Як звычайна, нашы кіраўнікі рыхтаваліся да візіту вялікага начальніка і на працягу некалькіх тыдняў (візіт старшыні аблвыканкама некалькі разоў пераноўсіўся) старанна наводзілі "паказуху". Напярэдадні такой важнай падзеі нават здолелі разагрэць і цалкам запусціць тэхналагічную лінію на модулі па вытворчасці крухмалу. Праўда, неўзабаве пасля візіту Пятра Рудніка, як толькі ўдарылі маразы, яна зноў зламалася. Ну а бруд з завода жанчыны пачалі вычышчаць задоўга да наведвання высокага госця. Тое самае адбывалася на жывёлагадоўчых комплексах у Цехціне і Машчаніцы, там нават у чаканні прыезду спадара Рудніка шмат для каго з працаўнікоў паадмянялі выхадныя. Любяць у нас пуціць пыл у вочы… Калі старшыня аблвыканкама сапраўды хоча даведацца пра рэальны стан падзей у рэгіёнах, раім яму прыязжаць без папярэджання.

Дарэчы, чамусьці мае шаноўныя калегі з раённай газеты "Зара над Друццю" свой артыкул аб візіце Пятра Рудніка назвалі "Губернатар наведаў Бялыніцкі раён". Наколькі я ведаю, Беларусь ужо хутка як сто гадоў не ўваходзіць у склад Расійскай імперыі і такой пасады, згодна Канстытуцыі, у нашай краіне проста неіснуе.

*Сяргей Семяновіч*

БЯЛЫНІЧЫ

# Карысная сустрэча

У гарадскім пасёлку Бялынічы адбылася сустрэча сяброў аргкамітэта партыі “Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя” Таццяны Шамбалавай і Пятра Сцяпанавіча Мігурскага з прыхажанамі Бялыніцкай “Царквы Новае жыццё”.

Удзел ў сустрэчы прынялі каля дваццаці чалавек. Разам з прыхаджанамі пратэстанцкага веравызнання актыўна ўдзельнічалі ў гутарцы некалькі прадстаўнікоў праваслаўнай і каталіцкай канфесій. Таццяна Шамбалава распавяла прысутным аб гісторыі ўзнікнення хрыстыянска – дэмакратычнага руху ў Беларусі пачынаючы з 1917 года, выклала тэзісы праграмы аднаўляемай партыі БХД. Пётр Мігурскі асноўную ўвагу ў сваім выступе акцэнтаваў на накірунках дзейнасці Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі ў сучасных умовах. Таксама ён падкрэсліў, што толькі вяртанне да спрадвечных хрысціянскіх каштоўнасцей можа аб’яднаць беларускі народ і прывесці яго да шчаслівага жыцця.

Выступоўцы адказалі на шэраг пытанняў, зададзеных бялынічанамі. Зацікаўленая гутарка рацягвалася больш за дзве з паловай гадзіны.

На сустрэчы было прынята рашэнне аб тым, што ўжо ў бліжэйшы час у Бялыніцкім раёне будзе створана першасная суполка аргкамітэта партыі “Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя”.

*Барыс Вырвіч*

УВАГА!

## БЕЛАРУСКАЯ АНТЫЯДЭРНАЯ РАССЫЛКА

ШТОДЗЕННЫЯ ПАВЕДАМЛЕНЬНІ НА ЭЛЕКТРОННУЮ ПОШТУ ПРА ПАДЗЕІ, ЗЬВЯЗАНЫЯ З АТАМНАЙ ЭНЕРГЕТЫКАЙ. ЗА И СУПРАЦЬ. ФАКТЫ, ЛІЧБЫ, МЕРКАВАНЬНІ. УСЕ, ХТО ХОЧА АТРЫМЛІВАЦЬ ГЭТУЮ ІНФАРМАЦЫЮ, МОГУЦЬ ПАДПІСАЦЦА, АДПРАВІЎШЫ ЛІСТ Ў СВАБОДНАЙ ФОРМЕ НА E-MAIL: MELIASHKEVICH@YAHOO.COM

## ДАПАМОЖНІК ДЛЯ НАСТАЎНІКА

ГОРАЦКАЯ АНТЫЯДЭРНАЯ ГРУПА ПРАПАНУЕ БЕСКАШТОЎНА МЕТАДЫЧНЫЯ ДАПАМОЖНІКІ ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ МАГІЛЕЎСКАЙ ВОБЛАСЬЦІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ПРАВЯДЗЕНЬНЮ ЎРОКАЎ, ГУТАРАК, КЛЯСНЫХ ГАДЗІНАЎ, ПРЫСЬВЕЧАНЫХ ДНЮ ПАМЯЦІ ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ ДЫ ІНЬШЫХ РАДЫЯЦЫЙНЫХ КАТАСТРОФАЎ. ДАПАМОЖНІК ВЫДАДЗЕНЫ Ў МАСКВЕ МІЖНАРОДНАЙ ГРУПАЙ <ЭКОЗАЩИТА!>. У ІМ ЗНОЙДУЦЬ ПАТРЭБНЫЯ МАТАР’ЯЛЫ НЯ ТОЛЬКІ КЛЯСНЫЯ КІРАЎНІКІ ДЫ ВЫХАВАЎЦЫ, АЛЕ Й ПЭДАГОГІ-ПРАДМЕТНІКІ. ЗЬВЯРТАЦЦА ТРЭБА ПА АДРАСУ РАДАКЦЫІ РАССЫЛКІ.



# План Юркова

ГОРКІ

Горацкая раенная газета “Ленінскі шлях” надрукавала артыкул мясцовага грамадзкага актывіста, эканаміста Андрэя Юркова “Тут і цяпер”, у якім ен выказвае свае прапановы па абароне ад крызісу мясцовага насельніцтва. Былы кандыдат у дэпутаты выклаў план супольных дзеянняў для мясцовай улады і грамадзкіх актывістаў. У сваім адкрытым лісце сп.Юркоў вызначыў чатыры неадкладныя крокі:

1. Стварыць у раёне антыкрызісную камісію з удзелам прадстаўнікоў улады і незалежных прафесіяналаў.

2. Тэрмінова распрацаваць план дзеянняў на выпадак рэзкага збяднення насельніцтва і вымушаных скарачэнняў.

3. Звярнуцца да ўраду з просьбай вярнуць ільготы інвалідам, студэнтам, пенсіянерам, шматдзетным і адзінокім мацяркам, каб палегчыць наступствы крызісу.

3. Спыніць авантуру з будаўніцтвам АЭС і накіраваць запланаваныя на яе сродкі на ўмацаванне нацыянальнай валюты і падтрыманне годных заробкаў.

Газета Горацкага райвыканкаму ў сваю чаргу заклікала чытачоў выказаць свае меркаванні наконт плану Юркова або выкласці ўласнае бачанне сітуацыі.

*http//horki.info*

# Электрастанцыя... На даху

АЛЬТЭРНАТЫЎНЫЯ КРЫНІЦЫ ЭНЕРГІІ – НАЙБОЛЬШ ПАПУЛЯРНЫЯ Ў ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ. ТОЛЬКІ Ў БЕЛЬГІІ КОЛЬКАСЦЬ СЕМ'ЯЎ, ШТО КАРЫСТАЮЦЦА ЭНЕРГІЯЙ АД СОНЕЧНЫХ БАТАРЭЯЎ, ЗА ГОД ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ Ў ТРЫ РАЗЫ.



Сонечныя батарэі на даху – гэта не даніна модзе, а хутчэй прагматызм. Такім чынам бельгійцы клапоцяцца пра сваю персанальную энергабяспеку.

ВІМ:

“Гэта – для нашых дзяцей, для будучыні. Не для мяне, для дзетак! У мяне трое дзетак, і я спадзяюся, што магу зрабіць свой невялічкі ўнёсак у ахову навакольнага асяроддзя: самому выпрацоўваць электраэнергію, а таксама думаць, як можна жыць эканомна”.

Камплект батарэяў для сям'і з 4 чалавек каштуе каля 23 тыс. еўраў. Мясцовыя ўлады кампенсуюць некаторую частку выдаткаў ды забавязуюцца купляць лішкі энергіі цягам 20 гадоў.

БАРТ РУЛС, АДДЗЕЛ АХОВЫ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ:

“Роля мясцовых уладаў – не толькі інфармаваць грамадзянаў пра ўсе перавагі сонечнай энергіі – а магчымасць ёй карыстацца існуе сёння для ўсіх, – але і стымуляваць людзей сапраўды пачынаць усталёўваць сонечныя батарэі ў сябе дома. Гэта пашырае іх магчымасці на альтэрнатыўныя крыніцы энергіі, якія не забруджваюць навакольнага асяроддзя”.

Бельгійцы падлічылі, што праз 10 гадоў сонечныя батарэі акупяцца, і святло ў дамах стане бясплатным. А з лішкаў энергіі ды ільготаў можна будзе нават атрымаць прыбытак.

ФРАНКІ:

“Плаціш у два разы менш падаткаў. Для нашай сям'і гэта прыстойная сума – 3600 еўраў у год. Гэтыя грошы нам вяртаюць з выплачаных падаткаў. І ўлады нашага гораду Бэвэрэну далі нам 800 еўраў на ўсталяванне панеляў”.

І хоць Бельгія – не самая сонечная краіна, адмыслоўцы прагназуюць, што колькасць карыстальнікаў сонечных батарэяў у бліжэйшы год як мінімум падвоіцца.

*Алесь Сіліч, Зміцер Ягораў, "Белсат"*

СКАНДАЛ

## КОНЦЕПЦИЯ ДЕЛА МЕНЯЕТСЯ

На сайте Белтелерадиокомпании прошла онлайн-конференция с серебряным призером Олимпиады в Пекине Вадимом Девятовским. Главной темой беседы стала предстоящая попытка спортсменов реабилитировать себя по обвинению в употреблении допинга.

11 декабря прошлого года дисциплинарная комиссия Международного олимпийского комитета (МОК) приняла решение о лишении медалей пекинской Олимпиады метателей молота — 31-летнего Вадима Девятовского и 32-летнего Ивана Тихона. Они обвинены в употреблении допинга. 17 августа в финальных соревнованиях В.Девятовский занял второе место, И.Тихон — третье.

В сообщении говорилось, что спортсмены должны вернуть медали и дипломы. При этом В.Девятовскому пожизненно запрещено участвовать в Олимпийских играх, поскольку он повторно уличен в применении допинга. Решение о дисквалификации атлетов должна принять Международная федерация легкой атлетики.

Спортсмены подали апелляцию в суд. Окончательный пакет документов должен быть представлен в Спортивный арбитражный суд в Лозанне до 19 февраля.

Вот что сообщил В.Девятовский: «К нашему счастью, вскрываются новые факты, очень важные для дела. Концепция меняется в лучшую для нас сторону. Единственное, что можно к этому добавить, сейчас мы задаем МОК те же вопросы, на которые они не ответили, когда вели слушание с дисциплинарной комиссией. Адвокат задает их повторно, потому что те разъяснения нас не устраивают».

*"Прессбол"*

Выбар №45 ЛЮТЫ 2009
Магілеўская абласная газэта. Выдавец: Магілеўская абласная кааліцыя дэмакратычных сілаў.

Галоўны радактар: Эдуард Брокараў, тэл. 545 89 83, электронная адрэса: brok61@yandex.ru
Наклад: 299 асобнікаў, фармат А4, 8 палос.
Падчас выданьня ужываюцца: беларуская (тарашкевіца), беларуская (наркомаўка) ды расейская мовы. Матар'ялы друкуюцца на мове аўтара. Палітычная й моўная цэнзура адсутнічае. Вітаюцца мастацкія творы, а таксама – журналісцкія матар'ялы на беларускай мове. Погляды аўтараў могуць не супадаць з пазыцыяй радакцыі. Радакцыя самастойна прымае рашэньні аб мэтазгоднасьці ўступлення ў перапіску, а таксама аб разьмяшчэньні бясплатнай сацыяльнай раклямы
У нумары выкарыстаны матар'ялы сайтаў: svaboda.org; racyja.com; milinkewits.org; pbnf.org; belsat.eu, uzgorak.na.by, atomby.net, charter97.org; horki.info, belarda.org